ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З КРАСАВІКА 1955 ГОДА ● № 5 (3641) ● СЕРАДА, 26 МАЯ, 2021

ВЫДАННЕ "ГОЛАС РАДЗІМЫ" ЧЫТАЙЦЕ Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА ПАРТАЛЕ ZVIAZDA.BY

Аляксандр Дарковіч: "Важна правільна выбіраць арыенціры" Стар. 4-5

Ваколіцы Рудзенска: Шалягі, Цітва, Варонічы... Стар. 6-7

"Жавароначчкі" пад небам Айчыны Стар. 8

КАШТОЎНАСЦІ

Мы будзем родную зямлю абараняць

На цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі Прэзідэнт Беларусі выступіў з хвалюючай прамовай

БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка выступае на Плошчы Перамогі

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў усіх жыхароў Беларусі з Днём Вялікай Перамогі. Нагадаў: "Чым далей сыходзяць у гісторыю гераічныя і трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, тым больш велічна й грандыёзна паўстае перад намі ахвярны подзвіг нашых дзядоў і прадзедаў. Тых, хто выратаваў чалавецтва ад заняволення й знішчэння. Гэта была эпахальная бітва за жыццё на зямлі, за збяражэнне роду чалавечага. Вялікая перамога дабра над сусветным ліхам". Прэзідэнт аддаў даніну павагі гераізму і стойкасці воінаў-франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў і працаўнікоў тылу, без якіх немагчымая была б Перамога. І запэўніў тых, хто падарыў нам нязгаснае святло Вялікай Перамогі: мы выстаім у сённяшняй жыццёвай барацьбе.

Памяць тых, хто загінуў у полымі вайны, памяць ветэранаў-пераможцаў, якія ўжо сышлі ад нас, удзельнікі ўрачыстасці на Плошчы Перамогі ўшанавалі Мінутай маўчання.

Прэзідэнт адзначыў, што кожны год беларусы прыходзяць да манумента Перамогі, прадаўжаецца традыцыя сустрэч франтавікоў і партызан ля Вечнага агню і ў іншых памятных месцах. Але ж вось парадокс: "У той час, калі мы клапоцімся пра захаванне памяці, паслядоўнікі акупантаў, іх паслугачоў — яны папракаюць нас у мілітарызме, праслаўленні вайны. Папракаюць нас — нашчадкаў тых, хто не прыйшоў з вайны. Кожны трэці. Мы, як ніхто іншы, сербанулі гэтага гора і ўвесь час кажам пра тое, што вайна — гэта страшна. Што нам не патрэбная вайна". На думку Прэзідэнта, сэнс такіх захадаў відавочны: "Марачы пра глабальнае панаванне, сучасныя неакаланіялісты наўмысна сеюць нацыянальную варожасць, плодзяць крывавыя канфлікты на планеце ды зноў спрабуюць апрануць моладзь у карычневую адзежу-уніформу. Робяць усё, каб мы забылі подзвіг нашых дзядоў і страшную праўду пра вайну. Менавіта таму нам навязваюць сцягі ды гімны, зняслаўленыя супрацоўніцтвам з гітлераўскімі забойцамі, — замест знакаў Вялікай Перамогі, міру і стварэння". Прэзідэнт заявіў: "Сёння мы павінны адкрыта гаварыць, што беларусы ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўпершыню ў сваёй гісторыі сутыкнуліся з масавым і планамерным знішчэннем мірнага насельніцтва. Гэта на руках фашыстаў, паліцаяў ды іншых калабарантаў кроў тысяч і тысяч, мільёнаў нявінных ахвяраў: жанчын, старых і дзяцей. Свет павінен ведаць і памятаць пра трагедыю нашага народа, беларускага народа. І мы будзем гэтую тэму падымаць на самы высокі міжнародны ўзровень. Каб яны памяталі і не забываліся. І хай нашчадкі нацыстаў нават не мараць, што, калі сыдуць апошнія сведкі генацыду беларускага ды іншых народаў, з імі сыдзе і гістарычная праўда".

У канцы прамовы Прэзідэнт заявіў: "Я разумею, пасля тых падзей, якія адбыліся ў мінулым годзе, і таго, што нам абяцаюць сёлета, мы некалькі, ну, шчыра кажучы, перанапружылі нашае грамадства. Можа, нехта залішне турбуецца пра мір і бяспеку. Можа, нехта ўвогуле ў тое перастаў верыць. Дык вось я цяпер звяртаюся да вас, да тых, хто не верыць, запомніце: пакуль нашае пакаленне жыве, Беларусь заўсёды будзе стаяць намёртва. Мы будзем жыць, мы будзем жыць на сваёй зямлі. І я клянуся вам у гэтым сваім месцы, што мы ніколі не дазволім глядзець на нашу зямлю з пагардай, на тую зямлю, якую ветэраны абаранілі ў гады ліхалецця і адваявалі. Мы будзем яе абараняць, чаго б нам тое ні каштавала. Я звяртаюся да вас, тых, хто насцярожыўся ў сувязі з апошнімі падзеямі. Нават не думайце і не хвалюйцеся за будучыню сваіх дзяцей, унукаў і за сваю будучыню. Мы зробім усё для таго, каб над нашай зямлёй ззяла вось такое сонца, як сёння, і было блакітнае неба. Мы зробім усё, каб маладыя мамы і таты са сваімі дзеткамі ў любы час сутак маглі выйсці на вуліцу і прайсціся па сваёй зямлі, як гэта было заўсёды. Так будзе. Я вам абяцаю, я клянуся, што так будзе! І я хачу, каб нас пачулі не толькі ў Беларусі, але і там, вы ведаеце хто".

Ветэраны і моладзь на Плошчы Перамогі

ПАМЯЦЬ

Салдат невядомы і родны

У тэматычнай экспазіцыі "Музея Памяці", што ў Храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць пра ахвяры, якія выратаванню Айчыны нашай паслужылі, збіраюцца звесткі пра ўдзельнікаў і ваенныя падзеі шматлікіх гістарычных перыядаў, у тым ліку й часоў Вялікай Айчыннай вайны

ISSN 0439-3619

9 770439 361003 21005

Прадметы часоў Вялікай Айчыннай сабраны ў асобным тэматычным комплексе. Многія з іх прынеслі для экспанавання прыхаджане храма. Гэта ўласныя рэчы, фотаздымкі, узнагароды іх бацькоў, дзядоў і прадзедаў, якія здабывалі для нас свабоду, але не вярнуліся з вайны. Памяць пра іх жыве ў сэрцах нашчадкаў. Цяпер яна рэхам адгукаецца і ў душах наведнікаў экспазіцыі. А імёны загінулых за нашу Радзіму штодзень у малітвах узносяцца да Усявышняга.

"Мы бачым: экспазіцыя не пакідае абыякавым нікога. І ўжо тыя, хто пабываў у Храме-помніку, вяртаюцца да нас са сваімі артэфактамі, расказваюць пра гераізм сваіх родных і блізкіх у гады вайны. Таму мы ўпэўнены, што яна будзе пастаянна папаўняцца", — расказвае кіраўніца музея Ганна Зайцава.

Ідзем з ёй па зале экспазіцыі "Наша памяць пра кожнага загінулага свяшчэнная!", прысвечанай заключнаму этапу вайны, калі Савецкая армія вызваляла ад фашызму краіны Еўропы. Дамінантай мастацкага вобраза гістарычна-этнаграфічнага комплексу "У роднай хаце" стала выява Беларускай Маці — манекен жанчыны ў натуральную велічыню. Яе правобразам паслужыла вядомая многім Анастасія Купрыянава, беларуская партызанка і маці-гераіня, усе сыны якой загінулі на вайне. Манумент маці-патрыётцы і яе загінулым сынам адкрылі ў 1975 годзе ў Жодзіне (Мінская вобласць). (Пра тое ды ўшанаванне памяці Пятра Купрыянава мы трохі пісалі: "Сын-Герой Анастасіі Купрыянавай" — ГР, 15.11.2018. — **Рэд.**) У "Музеі Памяці" Беларуская Маці трымае ў руках пахаронку на сына, што загінуў. Вобраз кранальны й шчымлівы. Шмат беларускіх жанчын атрымлівалі ў ваенныя й пасляваенныя гады такія весткі, за кожнай з іх — боль, роспач і слёзы. У храме сабраны цэлы комплекс такіх пахаронак.

Музейная экспазіцыя перыяду Вялікай Айчыннай вайны

→ Стар. 3

ЭСТАФЕТА ПОДЗВІГУ

Газетчыкі з бранскіх лясоў

Беларусы Браншчыны ўшанавалі памяць ваенных журналістаў

Удзельнікі акцыі ля Знака-помніка франтавым журналістам

Напярэдадні Дня Перамогі сябры Беларускага зямляцтва на Браншчыне разам з навучэнцамі 28-й школы Бранска на чале з настаўніцай Аленай Голасавай пабывалі ля Помніка ваенным журналістам. Там яны ўшанавалі памяць усіх воінаў, якія перамаглі фашызм у Вялікай Айчыннай вайне, усклалі кветкі да помніка.

Кіраўнік зямляцтва, палкоўнік дзяржбяспекі ў адстаўцы Мікалай Голасаў распавёў удзельнікам святочнай акцыі, што якраз на месцы, дзе пасля вайны была створана, добраўпарадкавана "Паляна журналістаў", у жніўні-верасні 1941 года выдаваліся і газета Бранскага фронту "На разгром врага", і газета "За Савецкую Беларусь". У бранскім лесе ў ліку тых, хто выдаваў газеты, плячо ў плячо з іншымі ваеннымі журналістамі працавалі маладыя тады беларускія пісьменнікі Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Максім Танк, Пімен Панчанка, Міхась Лынькоў. Адарваныя ад роднай зямлі яны выдавалі баявую газету, што несла друкаванае слова нянавісці да ворагаў. Газеты не толькі паступалі ў вайсковыя злучэнні, але й перакідваліся цераз лінію фронту ў Беларусь, якая была ў варожай акупацыі, у партызанскія атрады. Газеты дапамагалі ў змаганні з ворагам, падтрымлівалі ў людзях надзею, што вораг будзе разбіты і Беларусь вызваліцца ад гітлераўцаў.

Намеснік старшыні зямляцтва, журналіст Рыгор Кажурын распавёў пра гісторыю стварэння помніка, пра тое, як у гады вайны на гэтым месцы загінулі ваенныя журналісты. Яны ў 1943 годзе прыехалі сюды, знайшлі схаваныя ў 1941-м друкарскія шрыфты — і тады грымнуў выбух. Сябар зямляцтва Іван Іванішка згадаў, як сам у маладосці, калі быў адным з кіраўнікоў камсамольскай арганізацыі, то з таварышамі добраўпарадкаваў помнікі загінулым воінам Чырвонай Арміі. Алена Голасава звярнула ўвагу вучняў на выбітыя ў граніце вядомыя радкі з "Песні ваенных карэспандэнтаў". Удзельнікі акцыі сфатаграфаваліся са сцягамі Расіі ды Беларусі, са стылізаваным сцягам-рэплікай беларускага партызанскага атрада. Пры вяртанні ў Бранск удзельнікі міні-аўтапрабега ўсклалі кветкі ля першага Знака-помніка франтавым журналістам, адкрытага ў Савецкім Саюзе яшчэ 7 мая 1990 года, а таксама ля помніка воінам-кіроўцам. На трасе сустрэчныя аўто віталі ўдзельнікаў акцыі гукавымі сігналамі.

Канстанцін Хамінскі,
г. Бранск
Фота: **Рыгор Кажурын**

Ад рэдакцыі. У маі 2013 года ў Бранску прэзентавалася кніга "Мы помним" кіраўніцы школьнага Музея гісторыі Бранскага фронта Аляўціны Пастуховай. Ёсць выданне і ў некаторых бібліятэках Беларусі. Аляўціна Еўдакімаўна працавала ў 56-й ды 60-й школах горада — і ў абедзвюх стварыла музеі. Разам з вучнямі ды іншымі педагогамі вяла велізарную работу па зберажэнні памяці пра вайну, і ў тым ліку пра ваенных журналістаў. Згаданая кніга сама па сабе — своеасаблівы помнік ім, аднаўленне й зберажэнне памяці пра тых, хто у ваенны час рабіў газеты "На разгром врага" і "За Савецкую Беларусь". Ідэйным натхняльнікам аўтаркі ў працы над кнігай быў бранскі журналіст, былы ваенны карэспандэнт франтавой газеты Аляксандр Карлавіч Лапін. У кнізе асобныя старонкі прысвечаны й згаданым беларускім пісьменнікам — старонкі сфатаграфаваў, даслаў у рэдакцыю Мікалай Голасаў.

Сама ж Паляна журналістаў створана ў бранскім лесе, за 15 км ад доследнай базы Бранскай тэхналагічнай акадэміі. Абсталявана памятнае месца столікамі, лаўкамі, альтанкай ды месцам для вогнішча, на паляне ўсталяваны помнік у форме стылізаванага пяра з двума старонкамі паходнага блакнота. Першы памятны знак там з'явіўся ў 1960-я гады, у маі 1990-га там адкрылі памятны знак у форме пяра, з зорачкай у цэнтры й надпісам пад ёй. З часам помнік разбурыўся, праект новага зрабіў Аляксандр Музалькоў, галоўны архітэктар Бранска — помнік урачыста зноў адкрылі 17 верасня 2005 года.

ВЕСТКІ З СУПОЛАК

"Лясная песня" за Уралам

Беларусы Зауралля паўдзельнічалі ў мерапрыемствах, прысвечаных Дню Перамогі

Актывісты НКЦ беларусаў Зауралля "Батькавщина" 9 Мая ў горадзе Кургане прынялі ўдзел у цырымоніі ўскладання кветак, вянкоў да мемарыялаў воінаў, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне. Пачалася цырымонія ля стэлы Герояў Савецкага Саюза з імёнамі воінаў-зауральцаў. Затым прадстаўнікі беларускай дыяспары на чале з кіраўніцай "Батькавщины" Людмілай Урванцавай усклалі кветкі да Вечнага агню на цэнтральнай плошчы горада і ўшанавалі памяць загінулых абаронцаў Радзімы.

У той жа дзень ансамбль "Журавачка", створаны пры беларускай суполцы, паўдзельнічаў у святочнай імпрэзе-канцэрце грамадскіх нацыянальна-культурных аб'яднанняў горада "Мы вместе ковали Победу". На беларускай мове гучала знакамітая "Лясная песня" ("Ой, бярозы ды сосны...") і народная беларуская песня "Бульба".

Рыгора Гарэшка

РАЗАМ

Стваральная сіла сяброўства

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак сустрэўся з намеснікам старшыні Усеўкраінскага саюза беларусаў Ігарам Мошкіным

Беларусаў ва Украіне — каля 240 тысяч, і, пэўна ж, не менш украінцаў цяпер жыве ў Беларусі. Таму зразумела, што духоўныя ды крэўныя, роднасныя повязі між нашымі народамі, краінамі надзвычай моцныя. У часе сустрэчы Аляксандр Румак расказаў госцю, як у Беларусі жывецца прадстаўнікам розных нацыянальнасцяў — якіх тут больш за 150. Упаўнаважаны падкрэсліў: нягледзячы й на змену месца жыхарства, людзі схільныя зберагаць свае нацыянальныя традыцыі, і беларуская дзяржава таму спрыяе: "У іх ёсць жаданне не забыць родную культуру, родную мову, а ў такіх пытаннях дапамога з боку дзяржавы вельмі важная. Сёння ў Беларусі зарэгістравана 205 нацыянальных суполак і 25 нацыянальных супольнасцяў. Пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў працуе Кансультатыўны міжэтнічны савет, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі амаль усіх нацыянальных супольнасцяў. Пры тым яны самастойна вырашаюць: як размеркаваць тую фінансавую дапамогу, якую аказвае ім дзяржава на правядзенне статутнай дзейнасці".

ЯЎГЕН ПЯСЕЦКІ

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак перадае Ігару Мошкіну камплекты беларускіх нацыянальных касцюмаў

Грошы ж выдаткоўваюцца найперш на культурнае развіццё, адукацыйную дзейнасць, выданне кніг пра жыццё прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў у Беларусі, на правядзенне імпрэзаў, якія ладзяць па краіне гэтыя суполкі. Да таго ж актывісты нацыянальна-культурных аб'яднанняў рэгулярна ўдзельнічаюць у акцыях "Нашы дзеці", "Тыдзень лесу" ды іншых. "Агульныя справы вельмі збліжаюць людзей, — дадаў Аляксандр Румак. — Таму для нас важна, каб жылі традыцыі, былі магчымасці для супляменнікаў збірацца разам, займацца грамадска карыснымі справамі. Наша дзяржава шмат робіць для таго, каб кожны мог развівацца з уплывам сваіх нацыянальна-культурных традыцый. У 2020 годзе было выдзелена больш за 37 тысяч рублёў на падтрымку працы нацыянальна-культурных суполак".

Ігар Мошкін расказаў пра дзейнасць Усеўкраінскага саюза беларусаў, скіраваную на зберажэнне й развіццё самабытнай культуры беларусаў Украіны. Адзначыў: на тэрыторыі Украіны жыве каля 240 тысяч нашых супляменнікаў. Там рэгулярна праходзяць імпрэзы, што спрыяюць пашырэнню беларускай культуры, мовы, нашых традыцый і звычаяў. А Дзень Незалежнасці Беларусі, Дзень роднай мовы і, вядома ж, Дзень Перамогі беларусы адзначаюць па ўсім свеце. "Кожная краіна і нацыянальнасць маюць права на існаванне, калі яны памятаюць сваю гісторыю. Украіна і Беларусь маюць вялікую агульную гісторыю. Калі ўзяць нават апошнія 100 гадоў — мы памятаем пра агульную Вялікую Айчынную вайну. Ваявалі беларусы з украінцамі, рускімі, прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў плячо ў плячо, разам адстаялі права на жыццё. Дзень Перамогі адзначаецца і ва Украіне, і ў Беларусі. Усе пра тое памятаюць. Перамога была агульная, ніхто яе не дзяліў", — адзначыў Ігар Мошкін. На яго думку, нягледзячы на тое, што Украіна ідзе па еўрапейскім шляху развіцця, эканамічныя сувязі між нашымі краінамі варта пашыраць.

На сустрэчы Аляксандр Румак ды Ігар Мошкін абмяняліся памятнымі падарункамі. Прадстаўнік Усеўкраінскага саюза беларусаў павёз з сабой сувеніры, кнігі, нацыянальныя касцюмы для актывістаў беларускіх дыяспар у Чарнігаве, Кіеве, Міргарадзе. Спецыяльна для заснавальніцы, старшыні чарнігаўскай суполкі "Сябры" Галіны Варажбіт, якая сёлета была дэлегаткай ад Усеўкраінскага саюза беларусаў на VI Усебеларускім народным сходзе, Аляксандр Румак перадаў беларускі нацыянальны касцюм. Прычым пашылі яго майстры па мерках, знятых з жанчыны, калі яна была на Бацькаўшчыне.

Намесніца Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Алена Радчанка знаёміла госця з Украіны, журналістаў з фотавыставай "Беларусь шматнацыянальная". На ёй прадстаўлены фатаграфіі, што адлюстроўваюць як багатае жыццё прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў у Беларусі, так і сустрэчы з актывістамі беларускіх суполак замежжа, з якімі апарат Упаўнаважанага цесна супрацоўнічае.

Наталля Талівінская

Дарэчы.

Сяброўка газеты з Чарнігава Галіна Варажбіт пахвалілася абноўкай: выставіла фотаздымкі на сваёй старонцы ў Фэйсбуку. Лайкаў, слоў захаплення сабрала шмат! Што цікава: нядаўна яна прымала віншаванні з днём нараджэння — і падарунак з Бацькаўшчыны якраз паспеў, дзякуючы Ігару Мошкіну, да святочнай імпрэзы. І мы далучаемся да шматлікіх віншаванняў, што атрымала вядомая супляменніца з розных краін. Дзякуем за вашу творчую працу на карысць Бацькаўшчыны, шаноўная Галіна! А пра вашы надзвычай папулярныя майстар-класы на канале Ютуб (дзясяткі тысяч праглядаў!) па вырабе традыцыйнай беларускай паляндвіцы, "пальцам пханай" каўбасы, пра створаны вамі разам з мужам Анатолем Дамашні беларускі музей — плануем расказаць больш падрабязней.

Салдат невядомы і родны

(Заканчэнне. Пачатак на с. 1)

"Гэта калекцыя з 20 вестак аб смерці, якія прыносілі матулям ці жонкам на іх сыноў і мужоў, — тлумачыць Ганна Іванаўна. — Ствараючы тэматычны комплекс, прысвечаны загінулым у краінах Еўропы ў часе вайны жыхарам Беларусі, па дапамогу мы звярнуліся ў архіў Мінабароны Беларусі. Папрасілі перадаць некалькі такіх дакументаў для нашай экспазіцыі. Усе яны на байцоў, прызваных з Мінска й Мінскай вобласці ў 1944 годзе, калі Савецкая армія была абяскроўлена, і вызваляць краіны Еўропы ў часе маштабнай наступальнай аперацыі набіралі маладых байцоў".



Храм памяці нашай

Атрымаць такую пахаронку маці было балюча, ды, пэўна, яшчэ больш гора несла вестка, што іх сын ці муж прапаў без вестак і невядома, дзе пахаваны. Сёння родныя такіх салдат і афіцэраў могуць даведацца пра іх лёсы непасрэдна ў храмавай экспазіцыі. Супрацоўнікі папаўняюць базу дадзеных са спісамі савецкіх салдат і афіцэраў, якія былі прызваны з беларускіх ваенкаматаў і загінулі ў перыяд з 1941 па 1945 гады. Іх асноўную частку прадаставіла Міністэрства абароны Беларусі: каля 24 тысяч прозвішчаў байцоў. Арыгіналы спісаў утрымліваюцца на мультымедыйных рэсурсах Расіі, у Абагульненым электронным банку дадзеных "Мемориал" і на сайце "Память народа".

Добраахвотнікі, якія імкнуцца расшукаць салдацкія медальёны на палях бітваў, спадзяюцца: з іх дапамогай удасца ўстанавіць і прозвішчы салдат, якія прапалі без вестак. Пошукавікі атрада й клуба "Виккру" з Магілёўшчыны, напрыклад, перадалі "Музею Памяці" некалькі такіх знаходак. У тым ліку персанальных салдацкіх медальёнаў з папяровымі ўкладышамі. Адзін з іх дапамог устанавіць імя Аркадзя Цімафеевіча Рашэтнікава, 1925 года нараджэння, ураджэнца Расіі — з Омскай вобласці, Амуцінскага раёна, вёскі Савінава. Ён быў прызваны ў армію ў сакавіку 1943-га. Прапаў без вестак у 1944-м, а дакладней — загінуў пры фарсіраванні Дняпра пры вёсцы Буйнічы Магілёўскага раёна. Пошукавы атрад "Виккру" выявіў медальён на месцы бою ў 1998 годзе. Аднасяльчане Аркадзя Рашэтнікава накіравалі тэлеграму з удзячнасцю кіраўніку пошукавага атрада Мікалаю Барысенку. Парэшткі воіна былі перапахаваныя ў брацкую магілу, якую даглядаюць навучэнцы Буйніцкай сярэдняй школы. Экспануецца таксама й медальён разведчыка Івана Васільевіча Рубана, 1916 года нараджэння, ураджэнца вёскі Печанюгі Ноўгарад-Северскага раёна Чарнігаўскай вобласці Украіны. Ён загінуў у 1941 годзе ля вёскі Сідаравічы Магілёўскай вобласці. На момант гібелі быў бацькам траіх дзяцей. Пошукавікі "Виккру" знайшлі яго медальён у 2018 годзе.

Шэраг прадметаў падаравалі музею й святары храма. Настаяцель Храма-помніка протаіерэй Фёдар Поўны перадаў некалькі дзясяткаў каштоўных экспанатаў розных гістарычных перыядаў, якія склалі аснову музейнай калекцыі, а протаіерэй Мікалай Сухановіч — самаробную партызанскую запальнічку часоў вайны, зробленую з кулямётнай гільзы. Калі яе рэстаўравалі, то выявілі дагэтуль нябачны воку надпіс "В. Т. Кулю. 1943 год". Экспанат выклікаў цікавасць у музейных супрацоўнікаў. Цяпер музейшчыкі хочуць даведацца: кім быў той чалавек. Ужо высветлена, што запальнічка — падарунак невядомаму пакуль В. Т. Кулю ад камандзіра партызанскага атрада, які дыслацыраваўся ў 1943 годзе, мажліва, на тэрыторыі Асіповіцкага раёна.

Імёны абаронцаў, якім не была аддадзена належная пашана раней, прадаўжаюць устанаўлівацца па нашыя дні. Але многія беларусы й дагэтуль не ведаюць, дзе пахаваны іх родныя, што загінулі ў часе Вялікай Айчыннай. Таму й пачалі збіраць зямлю з месцаў баёў, размяшчаць яе ў капсулах у крыпце Храма-помніка, што ў Мінску. Адной з самых значных у плыні падрыхтоўкі да святкавання 75-годдзя Перамогі летась стала Міжнародная акцыя "На славу агульнай Перамогі!". Тысячы людзей далучыліся да яе ва ўсіх рэгіёнах Беларусі ды за яе межамі. Зямлю з палёў бітвы збіралі й накіроўвалі ў Беларусь жыхары Нарвегіі, Польшчы, Сербіі, Фінляндыі, Малдовы, Украіны, Латвіі, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Эстоніі, Расіі. Яна была дастаўлена з Цэнтральных могілак Вены (Аўстрыя), Мемарыяльных могілак Керэпешы ў Будапешце (Венгрыя), Трэптаў-парку і Мемарыяла загінулым савецкім воінам у Цірграртэне ў Берліне (Германія), Могілак-маўзалея савецкіх воінаў у Варшаве (Польшча), Мемарыяльных могілак Славін у Брацісла ве (Славакія), Мемарыяла савецкім воінам на Альшанскіх могілках (Чэхія), Мемарыяльных Антакальнскіх могілак у Вільнюсе (Літва), Мемарыяльнага комплексу "Вызваліцелям Бялграда" (Сербія), з магіл савецкіх воінаў-вызваліцеляў у Кіркінэсе (Нарвегія)... Цяпер, каб пакланіцца магіле невядомага салдата, дастаткова прыйсці ў Храм-помнік, дзе ў крыпце й захоўваюцца капсулы з зямлёй.

Каля манітора са спісамі загінулых беларускіх салдат

Экспазіцыя "Музей Памяці" — гэта лагічны працяг крыпты. З усяго свету ў гэтыя месцы сцякаюцца звесткі пра ваенныя падзеі перыяду XI—XXI стагоддзяў, у тым ліку і 1941-45 гадоў, устанаўліваецца, колькі жыхароў Беларусі загінула на палях бітваў, удакладняюцца іх імёны. Навуковая канцэпцыя экспазіцыі была распрацавана ў 2018 годзе, праца над яе рэалізацыяй заняла каля трох гадоў. Амаль 500 артэфактаў і прадметаў музейнага значэння размясціліся на плошчы ў 300 квадратных метраў на ніжнім узроўні храма.

Збор матэрыялаў прадаўжаецца. Наперадзе ў спецыялістаў Храма-помніка вялікая праца па фарміраванні агульнага Зводнага спісу ўсіх вязняў лагера смерці "Трасцянец" і стварэнне ў наступным годзе Інфармацыйнага цэнтра экскурсійнага абслугоўвання з музейнай экспазіцыяй на тэрыторыі былога лагера. Яна, як вядома, знаходзіцца ў межах Заводскага раёна Мінска і Мінскага раёна.

Ганна Лагун

СУПЛЯМЕННІКІ

Ушанавалі памяць Мікалая Дрынеўскага

Мемарыяльная дошка ў гонар ураджэнца вёскі Тонеж (Лельчыцкі раён Гомельшчыны) адкрыта ў крымскай Еўпаторыі

Сонечна і ўрачыста было красавіцкім днём у курортнай частцы горада, калі там адкрывалі мемарыяльную дошку ў гонар Мікалая Дрынеўскага (25.04.1938 — 27.04.2018): прафесара, доктара медыцынскіх навук, першага кіраўніка НДІ дзіцячай курорталогіі ды фізіятэрапіі (з 1978 па 2003 год), ганаровага грамадзяніна Еўпаторыі. Усталявалі дошку на будынку згаданай установы (цяпер — НДІ дзіцячай курорталогіі, фізіялогіі ды медыцынскай рэабілітацыі), дзе ён доўгія гады працаваў, не выпадкова менавіта ў 20-х чыслах. Сёлета — 83 гады ад часу яго нараджэння (25 красавіка) і 3 гады, як не стала нашага супляменніка (27 красавіка). Вяла ж імпрэзу вучаніца Мікалая Дрынеўскага: доктар медыцынскіх навук, прафесар, дырэктар інстытута Таццяна Галубова. Цёпла, са шчыраю ўдзячнасцю згадвала яна патрыярха курорта. Менавіта з яго дабраславення Таццяна Фёдараўна стала дырэктарам НДІ, сама цяпер зберагае традыцыі, жывую повязь пакаленняў.

Добры след у душы кожнага з нас пакінуў Мікалай Паўлавіч. Розныя людзі ў часе ўрачыстасці дзяліліся ўспамінамі пра яго. Казалі: па складзе характару, талентах, асабістых якасцях быў ён адметным. Удумліва, з душою падыходзіў да спраў і навуковых, і сямейных, і клопатаў дэпутацкіх — у складзе гарсавета. Дарэчы, ажно праз 10 скліканняў (1973—1992) выбіраўся дэпутатам Еўпатарыйскага гарсавета, у 2016-м стаў Ганаровым грамадзянінам горада Еўпаторыі. Жыў адкрыта, залучаючы ў арбіту свайго насычнага жыцця аднадумцаў. Непасрэдна ўдзельнічаў 24 гады таму ў стварэнні беларускай суполкі "Сябры": яна працавала больш за 20 гадоў. А пасля яе перарэгістрацыі, з 2018-га, жыва ўдзельнічаў у жыцці Мясцовай беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Крым — Беларусь" у Еўпаторыі.

У час адкрыцця мемарыяльнай дошкі

Была ў пяці братоў Дрынеўскіх традыцыя: ездзіць на Вялікдзень і Радаўніцу на Палессе, у Тонеж, родную вёску. Пасля паездак падсілкоўваўся наш сябар духам Бацькаўшчыны, вяртаўся да актыўнай дзейнасці, а працаваў шмат і ўпарта. Дзяліўся з беларусамі горада сваімі думкамі-ўражаннямі. Шмат разважалі мы аб простых рэчах, з якіх і складаецца жыццё, стасункі між людзьмі. Ён быў для нас узорам чалавека рэдкай душэўнай прыгажосці, які моцна, шчыра любіў Радзіму-Беларусь.

І калі знялі белую тканіну з мемарыяльнай дошкі, то прыціхлі ўсе, і было адчуванне: ён з намі, ён усё бачыць і чуе. Казалі добрыя словы ў памяць пра Мікалая Паўлавіча калегі, сябры, прадстаўнікі гарадміністрацыі, грамадскасці, сваякі. Я нагадала, што і Беларусь, якая ўзгадавала яго, выхавала, была спалучана з ім сотнямі непарыўных ніцяў, памятае свайго сына. Казала пра тэкст "Паляшук на Еўпатарыйскім курорце", змешчаны ў газеце "Голас Радзімы" (04.05.2020). Прачытала верш нашага Песняра Янкі Купалы "Спадчына" — любімы твор Мікалая Паўлавіча.

Так калегі віншавалі Мікалая Дрынеўскага з 80-годдзем

Сябры суполак "Крым — Беларусь" і "Беларускі Крыма" імя Еўфрасінні Полацкай 27 красавіка замовілі паніхіду ў мясцовым храме ў імя Свяціцеля Лукі Крымскага. Вёў набажэнства настаяцель храма протаіерэй Уладзімір Бадах, які, як і святы (у свеце Валянцін Война-Ясянецкі), мае беларускія родавыя карані.

Дзіна Шаўчэнка,
кіраўніца суполак "Крым — Беларусь" і "Беларускі Крыма" імя Еўфрасінні Полацкай

Аляксандр Дарковіч: "Важна правільна выбіраць арыенціры"

З першым намеснікам старшыні савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Беларусаў Расіі гаворым пра тое, як адладзіць гарманічны дыялог пакаленняў, умацоўваць і развіваць беларускую дзяржаву, не паўтараць памылак мінулага — каб зберагчы незалежнасць Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак у №4 за 26 красавіка 2021 г.)

— Аляксандр Васілевіч, вы адзначылі, што сёння вельмі важная праца з моладдзю ў патрыятычным кірунку. А ці ёсць водгук маладых людзей на вашыя мерапрыемствы, прыкметы іх цікавасці да такой тэмы?

— Вядома ж, ёсць, і не толькі ў форме звыклых цяпер лайкаў. Мы актыўна, сістэмна займаемся патрыятычным выхаваннем моладзі. Ні нам, ні тым, хто прыйдзе пасля нас, нельга забываць гісторыю роднага краю і трэба, скажу як ёсць, мэтанакіравана выхоўваць патрыётаў. Мы атрымалі ў спадчыну выдатныя гены — іх яшчэ называюць генамі пераможцаў — якія дапамаглі нашым бацькам, бабулям і дзядулям, прабабулям і прадзедам выйграць Вялікую Айчынную вайну. Нам ёсць на каго раўняцца, ёсць з каго "рабіць жыццё". Цяпер відавочна, што з кожным годам рытм жыцця паскараецца, і маладыя людзі пагружаныя ў бягучыя клопаты, ім хочацца жыць "тут і цяпер". Ім ужо для асобаснага росту недастаткова сустрэч і аповедаў пра нашу гісторыю, пра далёкую для іх вайну. Такая рэальнасць. Таму нам трэба ўлічваць гэта: вучыцца дзейнічаць у новых умовах, ісці ў нагу з часам, прымаць новыя формы і метады працы. Прычым іх трэба пастаянна ўдасканальваць. Зносіны маладых людзей сёння ідуць у асноўным праз сацсеткі. Значыць, трэба актыўна карыстацца гэтым рэсурсам: ствараць мабільныя прыкладанні, гульні, звязаныя з гісторыяй, і гэтак далей. Другі момант. Мы павінны арыентавацца і на розум, і на пачуцці маладых людзей. Прывучаць іх пры тым да годных, высокіх узораў народнага мастацтва, напрыклад — а не проста дзяўбці: "Любі Радзіму!". Для гэтага, дарэчы, нядаўна ФНКА Беларусаў Расіі падпісала дагавор аб супрацоўніцтве з Наталляй Карчэўскай, новым рэктарам Белдзяржуніверсітэта культуры й мастацтваў. Мы знайшлі з Наталляй Уладзіміраўнай у гэтым пытанні поўнае паразуменне: што культуру беларускую трэба за мяжой прадстаўляць на высокім узроўні. Бо ёсць тыя, хто займаецца гэтым прафесійна, і ёсць аматарства... Мы нацэленыя на супрацу ў першую чаргу з педагогамі беларускіх кафедраў, рэжысёрамі з Універсітэта культуры. Каб годна была прадстаўлена культура наша ў Расіі — мы з імі гатовыя супрацоўнічаць. А таксама з тэатральнымі дзеячамі, пісьменнікамі... Каб не было кумаўства, як мы называем, а быў у гэтай важнай справе добры, прафесійны ўзровень.

— Вы пакуль арыентуецеся на мерапрыемствы ў рэжыме анлайн?

— Да гэтага, вы ж бачыце, змушае нас "баявая абстаноўка". Але мы гатовыя й да масавых мерапрыемстваў. Ёсць нямала й такіх праектаў. Падумваем аб правядзенні ў Расіі Дзён беларускай культуру пад сцягам ФНКА — у адным з рэгіёнаў, дзе ў нас моцныя, актыўныя арганізацыі. Сёлета плануем пасяджэнне выязнога савета, і туды ж культурныя сілы падцягнем. У планах — запрасіць, можа, і тэатральную трупу, і выставу правесці, і майстар-класы...

— Гэта ўсё сумесна з аддзяленнямі Пасольства Беларусі ў Расіі думаеце праводзіць?

— Камунікацыі, адміністрацыйны рэсурс Пасольства нам, вядома ж, у такой працы лішнімі не будуць. Але ў прынцыпе мы маем досвед самастойнага правядзення такіх мерапрыемстваў на высокім узроўні. Патлумачу. У студзені 2019-га ў Расіі быў зацверджаны "План рэалізацыі ў 2019-2021 гадах Стратэгіі дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі". Гэта цэлы комплекс мер, накіраваных, у прыватнасці, "на гарманізацыю сацыяльна-эканамічных умоў для эфектыўнай рэалізацыі дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, садзеянне этнакультурнаму развіццю народаў Расіі". У адпаведнасці з дакументам цяпер Федэральным агенцтвам па справах нацыянальнасцяў выдзяляюцца сродкі ФНКА — і не толькі нашай — для рэалізацыі статутнай дзейнасці пад заяўленыя праекты. І сістэма прэзідэнцкіх грантаў у нас ёсць, але гэта — як рэзервовы варыянт. Мы сфарміравалі ўжо дзве заяўкі: адна — з рэалізацыяй у Крыме, другая — у Томску. Магчыма, з Крымам справімся сваімі сіламі, а ў Томску праект рэалізуем з калектывамі з Беларусі. Дарэчы, напрацоўкі добрыя ў нас ёсць. Скажам, на Купалле-2019 у нас быў народны ансамбль народнай песні "Вязанка": прыязджаў з вёскі Вяззе Асіповіцкага раён Магілёўшчыны. Проста супер выступілі! Аўтэнтычна, душэўна, прыгожа. І "Святкі", калектыў з Мінска, тады прыязджаў — пра яго я ўжо згадваў. З раніцы да ночы было ў нас Купалле. (На старонцы "Вязанкі" ў Фэйсбуку ёсць фотаздымкі, запіс: "3 ліпеня 2019 г. Яшчэ трошкі беларускага Купалля ў Маскве. Дзе б мы ні былі — ці то ў Вільнюсе, ці то ў Маскве — а беларускія традыцыйныя танцы заўсёды запальваюць людзей, выклікаюць усмешкі, радасць. Майстар-клас па танцах мы праводзім з задавальненнем!!! Irina Zabavskaya". — **Рэд.**)

— Ці ёсць зваротная сувязь ад маладых людзей, на якіх у працы вы арыентуецеся?

— Не буду казаць за ўсю арганізацыю — выкажу асабістае меркаванне. Шмат цяпер гавораць аб працы з моладдзю, яе патрыятычным выхаванні. Але ж ці ідзем мы ў нагу з часам? Што можам прапанаваць маладым людзям цікавае? Згадваю, да нас у школу ў 70-я паклікалі ўдзельніка Грамадзянскай вайны, які ваяваў у конніцы Будзёнага. На той час такая форма выхаваўчай работы была звыклай. Хоць, самі разумееце, ні пафатаграфаваць, ні лайкі сабраць было тады немагчыма. Цяпер многія грамадскія інстытуты займаюцца выхаваннем. Пачынаючы з сям'і. Сацыялізацыя чалавека праходзіць праз дзіцячы сад, школу, ВНУ ці прадпрыемства, войска. Плюс розныя грамадскія арганізацыі. Вынік? Мы бачым... Хоць нічога трагічнага і няма ў тым, што маладыя людзі па-рознаму шукаюць сваё месца ў жыцці. Нават у падзеях мінулага года ў Беларусі трагедыі не было. Рубікон, пагадзіцеся, не быў пройдзены. На шчасце, не ўспыхнула грамадзянская вайна — вобразна кажучы, з тачанкамі-кулямётамі. Мы ведаем з гісторыі: тады белыя наступалі на чырвоных і наадварот, забівалі-расстрэльвалі адзін аднаго. Канфлікты ж у 2020-м былі, што хаваць. Але без масавых радыкальных формаў. І ўсё ж высновы мы зрабіць павінны. Адна з іх: формы й метады работы з моладдзю і ў Беларусі, і ў Расіі, і ў іншых месцах на постсавецкай прасторы павінны пастаянна ўдасканальвацца. Не варта спыняцца. Дзяржмашыны не павінны зацягваць на гады рашэнні, якія датычацца моладзі, а значыць — нашай з вамі вельмі блізкай будучыні. Моладзі патрэбна, кажучы яе слэнгам, дзвіжуха, патрэбна самарэалізацыя. А як гэта прапанаваць, у якіх формах? Канцэрты? Не ўсе пойдуць. Кнігі? Нямногія маладыя людзі чытаюць іх — прынамсі, у друкаваным выглядзе. Выйшаў чалавек са школы, адкрыў смартфон — і жыве далей у гэтай інфармацыйна-эмацыйнай прасторы.

СА СТАРОНКІ ГУРТА Ў ФЭЙСБУКУ

Анатоль Ярмоленка ды ансамбль "Вязанка" — творчыя партнёры ФНКА Беларусаў Расіі

— І яшчэ рознымі камп'ютарнымі гульнямі цяпер школьнікі захапляюцца...

— А што мы, хто нібыта клапоціцца пра ваенна-патрыятычнае, маральна-этычнае, інтэрнацыянальнае выхаванне нашых дзяцей, унукаў, прапанавалі ў такія тэмы з камп'ютарных гульняў? А гэта ж магчыма! Праз гульні можна рэалізаваць прынцып: забаўляючы — адукоўваць. Займальна распавядаць пра нашу ваенную гісторыю. У мяне на гэты конт ёсць шэраг ідэй — хто зацікавіцца, магу падзяліцца. Праз гульні можна крэатыўна прыадкрываць факты з гісторыі, распавядаць пра культуру, традыцыі розных народаў. І гэта нядорага, у прынцыпе, каштуе: у раёне 2 мільёнаў расійскіх рублёў. Для дзяржавы — зусім невялікія грошы. Гэта я да чаго? Калі цяпер моладзь уся ў інтэрнэце — то менавіта там з ёй і трэба размаўляць. На яе мове. Каб там была і гульня, і спаборнасць, і пазнавальная інфармацыя, ну і свядомасць маладых людзей да важных для грамадства пытанняў спакваля трэба там паварочваць.

— Адзін з нашых аўтараў з Санкт-Пецярбурга прапанаваў цікавую ідэю: высадзіць Зялёны пояс партызанскай славы ў месцах, дзе праходзілі жорсткія баі партызан з нямецкімі часткамі, якія замыкалі кальцо блакады вакол Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Дарэчы, ва Ушачах у памяць пра тыя падзеі створаны мемарыял "Прарыў". Палкоўнік запасу, ураджэнец вёскі Матырына Ушацкага раёна Васіль Шалак прапаноўвае пашырыць мемарыял, сіламі моладзі прызыўнога ўзросту, непасрэдна прызыўнікоў рэалізаваць праект. Прызываюць, скажам, хлопца ў войска — і ён дрэва ў памяць аб такой важнай падзеі саджае... Альбо па прыходзе з войска — таксама варыянт! Мы пра задуму пісалі: "Радасць і боль «Прарыву»" (ГР, 20.05.2019). На жаль, падтрымкі ў Беларусі Васіль Іванавіч не знаходзіць. А ў Расіі, як вядома, рэалізавалі ж у 60-я гады знакавы праект: па ініцыятыве паэта Міхаіла Дудзіна стварылі Зялёны пояс славы Ленінграда. Ён уключае каля 50 аб'ектаў, пояс — гэта амаль 200 кіламетраў дарог па месцах абароны блакаднага горада. Мабыць, ведаючы пра тое, беларус-афіцэр з Піцера й задумаў на малой радзіме Зялёны пояс. У ім закладзена як патрыятычная ідэя абароны Айчыны, так і экалагічная: абароны Маці-Зямлі. Бо не сакрэт, што найлепшым чынам ад глабальнага пацяплення, змяненняў клімату абараняюць планету менавіта дрэвы, зялёныя насаджэнні.

— Задума цікавая, можна будзе да яе прыгледзецца, і актывістаў беларускай дыяспары да гэтага падключыць. Скажам, у наступным годзе па вясне закласці гэты Зялёны пояс... Але, вы ж разумееце, немінуча ўзнікне шэраг тэхнічных пытанняў — у прыватнасці, з адвядзеннем зямель, фінансаваннем праекта.

— Дзякуй за разуменне, Аляксандр Васілевіч! Калі складзецца — мы гатовыя выступіць інфапартнёрам пры рэалізацыі праекта. А вы самі адчуваеце духоўныя повязі з Палессем, з Давыд-Гарадком, дзе нарадзіліся? Падтрымліваеце кантакты з малой радзімай?

— Апошні раз быў там летась: калі ў Давыд-Гарадку святкавалі Каляды, праводзілі ў чарговы раз абрад "Конікі".

— У нас выйшаў тэкст "З Падмаскоўя — у «Конікі»" (ГР, 17.02.2020), прычым аўтар, харэограф Мікола Котаў, напісаў, што ў абрадзе паўдзельнічалі госці з Падмаскоўя, Гедымінас Таранда...

— Лепш за ўсё "Конікі" на свае вочы ўбачыць. А яшчэ лепш — у тым абрадзе паўдзельнічаць. І я рады, што нам тое ўдалося. Едуць людзі, як той казаў, станоўчыя эмоцыі атрымаць. Мы для таго аўтобус арандавалі, з намі прыязджалі прафесійныя артысты, абрадавыя калектывы, якія ўдзельнічаюць у фестывалях па ўсёй Еўропе. Сам антураж, дух вясёлага народнага карнавалу ўражвае, прыцягвае людзей з розных краін, а гасціннасць і шчодрасць гарадчукоў, якія больш за 100 гадоў зберагаюць тыя традыцыі, самі рыхтуюцца

ФНКА БЕЛАРУСАЎ РАСІІ

Прадстаўнікі кіраўніцтва ФНКА Беларусаў Расіі ў Мінску на сустрэчы з Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Люты 2021г.

й праводзяць свята, па водгуках усіх гасцей робяць яго сапраўды ўнікальным. А ёсць і "Дажынкі", і "Мотальскія прысмакі" ды іншыя імпрэзы, якія паказваюць шырокую душу беларускую. Мы ж хацелі пайсці далей і ў гонар 920-годдзя горада зрабіць новы фэст: Дзень лодак, або Лодкавы фэст. Але пакуль не склалася — з-за сітуацыі з каранавірусам. Правядзем у будучыні. Усё для таго ўжо зараджана. Вы ж ведаеце: на гербе Давыд-Гарадка ёсць выявы ракі й залатога судна. Гедымінаса Таранду гэта, як убачыў, вельмі ўразіла. І ўзнікла цікавая ідэя. Усё ідзе да таго, каб праводзіць Лодкавы фэст у два дні — разам з Днём горада. Задумалі зрабіць гістарычную рэканструкцыю — у жывых гарадскіх дэкарацыях, пры Замкавай гары, прысвечаную заснаванню горада князем Давыдам. Спонсараў мы знайшлі, многія адгукнуліся: беларускія міністэрствы культуры, спорту й турызму, федэрацыя веславання на байдарках і каноэ, шэраг арганізацый спартыўных, рэканструктары з Расіі.

— У вас асабіста больш цёплыя пачуцці выклікае Давыд-Гарадок ці Брэст?

— Абодва месцы па-свойму дарагія для мяне. У Давыд-Гарадку, як вы ведаеце, нарадзіўся: на вуліцы Талстога, 52, і дом той стаіць, я пражыў там шэсць гадоў. У памяці засталіся яркія ўспаміны пра ўнікальны старажытны горад. Суседка там, дарэчы, што жыла насупраць, неяк мяне пазнала: "Ой, Саша...". А з шасці гадоў не бачыла! У Брэсце я заканчваў школу, бацькі там жывуць. За кошт сваіх сувязяў магу я сабе дазволіць пасільна дапамагаць у рэалізацыі культурных праектаў, якія спрыяюць умацаванню расійска-беларускага братэрства. Я ўвогуле вельмі люблю Палессе: там адчуваеш усю шырыню й глыбіню Беларусі. Там дзівосная прырода, мноства ўсякіх птушак: дзікіх гусей, буслоў... Запаведны край. А недалёка — й знакамітыя Альманскія балоты, на якіх у савецкі час дзейнічаў Мерлінскі палігон. Думаю, там ёсць месцы, дзе, як кажуць, нага чалавека не ступала. Зайцы, алені, казулі, кабаны... Неяк сваяк мой убачыў больш за 120 зайцоў ды ў адным месцы! Я падумаў спачатку — прыкол, а ён сфоткаў і даслаў. У яго сад вялікі, поле, і ён з восені нешта не прыбраў: капусныя храпкі, ці што, заставаліся на полі. Раніцай выходзіць — усё поле ў зайцах! Гэта на Століншчыне, у вёсцы Бераженое.

— Такімі здымкамі народ на фотасафары завабліваць. Толькі капусту высаджвай...

— Такія месцы, як Давыд-Гарадок і ваколіцы, унікальныя і людзьмі. Там здаўна ўсе вельмі працавітыя, у аснове іх жыцця — праца на зямлі. А яна там урадлівая, і ўмеюць палешукі рукі да яе прыкласці. Шмат чаго вырошчваюць і прадаюць. За савецкім часам кветкі, насенне прадавалі па ўсім Саюзе. Цяпліцы ставілі. Тэхналогіі адпрацавалі: агуркі вырошчваюць (успомнім Альшаны...) і экспартуюць, шмат чаго яшчэ. Прычым па частцы эканомікі там вялікіх пераменаў, мне здаецца, не прадбачыцца. Чыгункі няма — а без яе складана развіваць прамысловую вытворчасць. А можна развіваць турызм. І яшчэ адзін фэст — для сезоннай раўнавагі — Давыд-Гарадку прыйдзецца вельмі дарэчы. Але яго за год на ногі не паставіш. І "Конікі" трэба на міжнародны ўзровень выводзіць. Паедуць на яго аматары жывых народных традыцый. А ўлетку — Лодкавы фэст. У заходнееўрапейскіх краінах ёсць гарадкі, якія за кошт фэст-праектаў і развіваюцца.

— Як у ФНКА Беларусы Расіі ставяцца да падзей 2020 года ў Беларусі?

— Ёсць розныя меркаванні, погляды. І таму, каб не сыходзіць у спрэчкі, мы цалкам выключылі з нашага парадку дня палітыку. І другое: вырашылі больш актыўна ўдзельнічаць у розных культурных імпрэзах. Запрашаць беларускія калектывы ў Расію і наадварот. Думаю, важна і беларусам, і расіянам у гэты няпросты час адчуваць, што мы побач, што мы блізкія людзі, прадаўжаць культурны дыялог. Што да мяне асабіста, то перажываў я за тое, што адбываецца ў Беларусі. Але давайце назавем гэта цяжкасцямі росту маладой беларускай дзяржавы. Для гісторыі ж 30 гадоў — тэрмін невялікі: 27 ліпеня 1990 года Вярхоўным Саветам БССР была прынята Дэкларацыя "Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі". А ў Расіі ўжо больш чым тысячагадовая гісторыя. Або возьмем Персію, Грэцыю, Італію... Нават ЗША ўжо 200 гадоў. У вас жа толькі пачатак станаўлення дзяржаўнасці.

— Давайце ўдакладнім, Аляксандр Васілевіч: гэта калі казаць пра новую беларускую дзяржаўнасць. Але была і "старая", ранейшая. Вы, пэўна ж, у курсе, што выйшла 5-томная "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці". У першым томе нашы навукоўцы пастараліся раскрыць вытокі, асаблівасці яе развіцця ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Разгледзелі, ахарактарызавалі яе такія формы, як Полацкае княства (зямля), Тураўскае княства, Кіеўская Русь, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая. Гэта ўсё — таксама наша гісторыя! У часе прэзентацыі першага тома, на пачатку 2019-га, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя заявіў: "Гістарычны досвед сведчыць, што за больш чым тысячагадовую гісторыю фарміравання беларускай дзяржаўнасці Беларусь ніколі не была каланіяльнай тэрыторыяй. Беларускі этнас, знаходзячыся ў складзе Кіеўскай Русі, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, заўсёды выступаў як складнік дзяржаваўтваральнага працэсу". Навуковец адзначыў, што гэта ўдалося "не толькі сфармуляваць, але й паказаць на аснове найбагацейшага археалагічнага матэрыялу, архіваў еўрапейскіх краін, Расіі. Мы не проста народ талерантны — мы народ, які насуперак усім складанасцям збярог сваю мову, культуру, традыцыі, звычаі ды ўрэшце здабыў сваю дзяржаўнасць".

— Пры ўсёй павазе да гістарычных дакументаў і меркаванняў навукоўцаў — факт застаецца фактам: на складаным гістарычным шляху беларусам не ўдалося зберагчы пераемнасць дзяржаўных традыцый, назавем гэта так. Вы згодны?

— Чаго ж тут адмаўляць: былі ў нашай гісторыі цяжкія часы... Нават мову беларускую знішчалі, забаранялі, навучальныя ўстановы зачынялі, эшалонамі людзей у Сібір везлі ці ў Германію...

— Так, мы гэта цяпер ведаем і памятаем. І падтрымліваем сувязі з вёскамі ў Сібіры, Забайкаллі, у якіх жывуць беларусы. Іх шмат. Самае дзіўнае, што нашы супляменнікі там зберaглі й сваю мову, сваю культуру. Гэта нашчадкі перасяленцаў-самаходаў, якія на рубяжы XVIII-XIX стагоддзяў кампактна сяліліся на далёкіх прасторах Расіі. Большасць з іх пра гістарычную Бацькаўшчыну ведаюць па аповедах, які перадаюцца з пакалення ў пакаленне і не разу ў ёй ні былі. Што да цяжкіх часоў, то я думаю, складзецца ўсё ўдала, калі ўсе гэтыя этапы, "узроўні" росту будуць пройдзеныя разумна й правільна, калі пры падтрымцы братоў з Расіі Беларусь знойдзе сваё месца ў складанай сусветнай абстаноўцы.

— На што, на ваш погляд, варта звяртаць асаблівую ўвагу на гэтым шляху?

— Ну вы ж ведаеце, што самы важны, стратэгічны рэсурс у Беларусі — гэта людзі. Таму цяпер вось за іх свядомасць і вядзецца жорсткая барацьба... Тут удалося зберагчы з савецкіх часоў і развіць вельмі добрую, якасную сістэму адукацыі. І важна яшчэ, каб адукаваныя маладыя людзі заставаліся людзьмі, якія не страцілі свае нацыянальныя рысы характару ў барацьбе за месца пад сонцам. А барацьба, паўтаруся, жорсткая. Кажуць жа і пра інфармацыйныя, пра гібрыдныя войны. Вельмі важна, каб чалавек умеў у такіх умовах заставацца чалавекам. Прыадкрыю сакрэт. Самая галоўная праца, якую праводзіла ФНКА Беларусаў Расіі — праз родзічаў, знаёмых, сяброў — зрабіць усё, каб не дапусціць у Беларусі фізічнага гвалту. Прычым я лічу: маленькі свой унёсак у гэтую справу мы-такі зрабілі. Не ўсё пакуль можна расказаць, але паверце: праца ішла месяцамі. Цяпер ці то пратэстныя дзеянні завершаны, ці то адкладзеныя да пэўнага часу — я не ведаю. Але нашу пазіцыю ў гэтай барацьбе мы агучылі, праявілі.

— Была інфармацыя ў СМІ, што і беларусы Масквы прыходзілі да беларускага Пасольства, прычым з рознымі думкамі.

— Не ўспрымайце блізка да сэрца тое, што хтосьці прыйшоў туды і там пастаяў. Па-першае, беларусаў у Маскве паводле дадзеных апошняга перапісу больш за 35 тысяч чалавек. З іх каля Пасольства было, мяркуючы па фатаграфіях, не больш за 10 чалавек. Некаторыя з іх ніякага дачынення да беларусаў не маюць, яны перыядычна ўдзельнічаюць у розных акцыях і каля іншых пасольстваў. У Санкт-Пецярбурзе, да прыкладу, жыве каля чатырох з паловай тысяч беларусаў — а прыйшлі да аддзялення Пасольства чалавек 5. Ну і што? Якую небяспеку яны нясуць для Беларусі? Аніякай. Як па мне, то калі хто-небудзь хоча ўплываць на тыя працэсы, што адбываюцца ў Беларусі, то ён тут і павінен жыць, мець падтрымку народа. Схавацца на тэрыторыі якой іншай дзяржавы і ваяваць за свае ідэалы? Гэта мне, як чалавеку ваеннаму, не зусім зразумела. І не зусім этычна, скажам так. Памятаеце сюжэт з фільма пра Чапая — з бульбай? Мабыць, тыя, хто сёння з-за бугра спрабуюць кіраваць пратэстнымі настроямі ў Беларусі, рухаць адтуль беларусамі — як бульбай... — урокі Васіля Іванавіча дрэнна засвоілі. А яшчэ паглядзіце фільм "Вяселле ў Малінаўцы" са зрушэннем тых кіношных вобразаў на сучасную Беларусь — таксама ж атрымаеце цікавы досвед. Бо класіка — яна заўсёды сучасная.

— Аляксандр Васілевіч, якой вам бачыцца беларуска-расійскія дачыненні ў будучыні?

— Дружалюбнымі, брацкім, душэўнымі. Як чалавек з беларускімі родавымі каранямі, які жыве ў Расіі, я зусім не хачу, каб паміж нашымі дзяржавамі, а тым больш народамі былі межы. Калі ж праект Саюзнай дзяржавы атрымае другое дыханне, калі будзе павага да суверэнітэту кожнай дзяржавы, то штучна збудаваць такія межы нікому не ўдасца.

— Ёсць яшчэ такі выраз: ідэі кіруюць светам.

— Так і ёсць. Вядома ж, не за адзін дзень штосьці важнае робіцца. Але трэба разумець: прымаючы тую ці іншую ідэю развіцця, мы закладваем рытм руху, кірунак развіцця грамадства, народа, дзяржавы. Трэба глыбока пралічваць і думаць: да чаго гэта прывядзе. Вы ж ведаеце: у Беларусі ды Расіі трохі цяпер адрозніваюцца падыходы да эканомікі, да прыватнай уласнасці. У вас яшчэ шмат буйных вытворчасцяў знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы. На іх ускладзена вялікая нагрузка па забеспячэнні сацыяльнай сферы. Паверце, не хацелася б, каб мая Беларусь прайшла выпрабаванне шокавай тэрапіяй, якую прайсці без страт практычна немагчыма. Мне хочацца, каб мая Бацькаўшчына зберагла свой вялікі чалавечы, кадравы, прамысловы патэнцыял і правільна выбірала арыенціры ў сваім руху ў будучыню.

Іван Ждановіч

На святочнай сцэне выступае "Купалінка"

Людміла Дзёміна з кадзетамі Навігацкай школы. Першая справа — яе ўнучка Марыя

Патрыятызм у спадчыну

У Тальяці ў гонар дня Перамогі прайшоў урачысты марш — з удзелам і юных сяброў суполкі "Нёман"

Святочныя мерапрыемствы ў горадзе адкрыліся ўрачыстым маршам у Цэнтральным раёне. Перад тымі, хто сабраўся на плошчы Свабоды, а сярод іх і ветэраны, прайшлі воінскія падраздзяленні Тальяцінскага гарнізона, пажарнай аховы, кіналагічных падраздзяленняў УУС па горадзе Тальяці, парадныя разлікі Ваеннага вучэбнага цэнтра Тальяцінскага дзяржуніверсітэта. Паўдзельнічалі ў маршы й курсанты Дзіцячага марскога цэнтра імя Героя Савецкага Саюза Яўгена Ніканава ды ўдзельнікі Усерасійскага дзіцячаюнацкага ваенна-патрыятычнага грамадскага руху ЮНАРМИЯ.

Асабліва хвалюючым быў святочны дзень для кіраўніцы беларускай суполкі "Нёман" Людмілы Дзёмінай, якая актыўна далучае да беларускіх спраў і сына Сяргея, і ўнукаў, і нават нявестку. Памяць пра вайну для Людмілы Іванаўны — свяшчэнная. Дзед яе, Іван Салановіч, быў прызваны ў рады Чырвонай арміі з Бабруйска на другі дзень вайны — і адтуль не вярнуўся. А бабуля Каця перажыла навалу ў Беларусі, акупаванай нацыстамі. Рада Людміла Іванаўна, што ва ўрачыстым маршы паўдзельнічалі сёлета абодва яе ўнукі. Віталь Шылкін раней спяваў у ансамблі "Купалінка", цяпер ён — курсант 3 курса Ваеннага вучэбнага цэнтра Тальяцінскага дзяржуніверсітэта. І вядучая праграм "Купалінкі" Марыя Шылкіна была "на маршы": як кадзет Навігацкай школы, якую з ахвотай наведвае. "Марыя ад Віталя імкнецца не адставаць, — напісала ў рэдакцыю Людміла Дзёміна. — Калі курсанты праходзілі маршам, было так прыгожа, кранальна! Слёзы ў мяне самі ліліся з вачэй".

У Дзень Перамогі ў Тальяці на розных творчых пляцоўках прайшлі канцэртныя выступленні калектываў КЦ "Автогорад" і горада ва ўсіх трох раёнах. Жыхары, госці горада цёпла прымалі й выступленні народнага ансамбля беларускай песні "Купалінка", якім кіруе Людміла Дзёміна.

Іван Іванаў

Ваколіцы Рудзенска: Шалягі, Цітва, Варонічы...

Літаратурна-краязнаўчы маршрут вандроўкі да мясцін, звязаных з лёсамі пісьменнікаў, паспрабуем выбудаваць непадалёку ад Мінска. У ваколіцах гарпасёлка Рудзенск, куды найлепей дабірацца на электрацягніку.

І вось першы адрас. Вёска Шалягі ўваходзіць ва Узлянскі сельсавет. Паводле перапісу 1897 года вёска — у Цітвянскай воласці, 146 жыхароў. Працаваў там хлебазапасны магазін. З Шалягоў родам паэт Рыгор Папараць, да біяграфіі якога не часта звяртаюцца гісто рыкі літаратуры, няма пра яго ні радка і ў шасцітомным біябібліяграфічным слоўніку "Беларускія пісьменнікі". Таму ў Шалягах — агледзімся. Згадаем, што ў перадваенныя гады Рыгор Папараць даволі актыўна друкаваўся ў газетах "Савецкая Беларусь", "Беларуская вёска", "Чырвоная змена", часопісах "Узвышша", "Полымя рэвалюцыі", "Беларусь калгасная". Малады паэт уваходзіў у літаб'яднанне "Маладняк", затым — у Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў. Асобнай кніжкай свае творы пры жыцці так і не выдаў. Гэтыя ды іншыя акалічнасці біяграфіі паэта Рыгора Папараці сталі вядомыя з сціплай кніжкі вершаў "Даруйце мне", якая ўбачыла свет у Мар'інай Горцы, у серыі "Паэты Пухавіччыны". Сродкі на выданне выдаткаваў Пухавіцкі райвыканкам. Укладальнік выдання і аўтар прадмовы — дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Аляксандр Прановіч.

Рыгор Папараць

Сярод іншых твораў кнігі ўражвае, асабліва кранае сэрца верш "Даруйце мне": "Даруйце мне.../ Выгнанніку даруйце,/ Мае пахілыя бярозы і стагі./ Па мне ў самоце, сцежкі,/ Не сумуйце./ Мяне паклікалі чужыя берагі". І вось як рухаецца думка творцы ў апошняй страфе: "Даруйце мне.../ Выгнанніку даруйце!../ Я падаю сапраўднасцю ля ног./ Я вас прашу:/ Мяне вясной закуйце/ Ў блакіт — бярозавы перапалох!" Напісаны радкі ў Ленінградзе ў 1927-м. Рыгор Папараць (сапраўднае прозвішча — Сапун) у 1921 годзе стаў слухачом рабфака пры Белдзяржуніверсітэце, пасля паступіў на яго ж медфакультэт. З часам юнак паехаў вучыцца ў Ленінградскі ўніверсітэт. (Чаму паехаў? Пэўна, не дарма ў вершы паэт называе сябе выгнаннікам... — **Рэд**.)

Таццяна Кекелева ў артыкуле "У справе жыццё людзі бачаць" піша: "У 1925 г. Рыгор Сапун паступіў на першы курс факультэта мовы і матэрыяльнай культуры Ленінградскага дзяржуніверсітэта. У 1930 г. факультэт рэарганізаваны ў Інстытут гісторыі, філасофіі ды лінгвістыкі (ЛИФЛИ). Разам з ім, але на розных курсах займаліся беларусы — паэт Язэп Пушча і будучы літаратуразнаўца Янка Шарахоўскі. На ленінградскі перыяд жыцця прыпаў росквіт літаратурнай творчасці Рыгора Папараці. У 1926 г. ён стварыў Ленінградскую філію "Маладняка" з сямі чалавек і даслаў пра гэта ліст у ЦБ "Маладняка" ў Мінск (машынапіс захоўваецца ў БДАМЛІМ у фондзе літаб'яднання "Маладняк"). Пазней стаў членам Беларускай секцыі Ленінградскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў, у працы якой браў актыўны ўдзел: уклаў і выдаў альманах "Цагліна ў падмурак" (сярод іншых твораў там надрукаваны апавяданне Р. Папараці "Грымасы" і вершы), як дэлегат удзельнічаў у III абласной канферэнцыі Ленінградскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў (15-21 мая 1930 г.) і г.д." (Роднае слова, 2002, №11).

4 лютага 1931 года самагубствам скончыў жыццё прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі Усевалад Ігнатоўскі. Пад уражаннем страты малады паэт напісаў верш, даў прачытаць і перапісаць сябрам. Праз некаторы час Рыгора выключылі з універсітэта за "крамольные стишки, порочащие партию и советское правительство". А ўвесну 1937-га паэта арыштавалі, ён прабыў у турме 6 месяцаў. Выпусцілі з фармуліроўкай: "Выслаць з Ленінграда і забараніць займацца літаратурнай дзейнасцю". Вярнуўся на радзіму. Настаўнічаў. Памерла першая жонка — балерына Элеанора. У 1940 годзе ажаніўся з Любоўю Арловай. У ліпені 1940-га перавёўся на працу ў Дудзіцкую сярэднюю школу Пухавіцкага раёна. На самым пачатку вайны ў сям'і паэта нарадзілася дачка Кансуэла. Прыйшлі ліхія часіны акупацыі...У час вайны партызаніў, змагаўся з ворагам у складзе партызанскай брыгады "Беларусь". Пасля быў на фронце. Пад Кёнігсбергам цяжка паранены. Вярнуўся дахаты. З 1945 па 1948 год быў дырэктарам і настаўнікам рускай мовы і літаратуры Дудзіцкай школы. У красавіку 1948-га паэта не стала. Такая вось кароткая біяграфія ў апантанага, улюбёнага ў літаратуру чалавека. Архіў паэта, перададзены жонкай Любоўю Арловай, зберагаецца ў Пухавіцкім раённым краязнаўчым музеі.

Як мне падаецца, у асобе Рыгора Папараці айчынная літаратура страціла тонкага лірыка, чые вершы, несумненна, былі б упрыгожаннем беларускага пісьменства. Некаторыя з іх пададзены ў згаданым вышэй нумары часопіса "Роднае слова".

Шалягі — радзіма крытыка, літаратуразнаўца Алеся Макарэвіча (нарадзіўся 30 жніўня 1918 года). У 1939-м закончыў літаратурна-лінгвістычны факультэт Мінскага педінстытута. Настаўнічаў у Хойніцкай сярэдняй школе на Гомельшчыне, і ў той жа год у лістападзе прызваны ў Чырвоную Армію. У час вайны у баі пад Ельняй быў цяжка паранены, трапіў у канцлагер. Вызвалены ў сакавіку 1945-га, да снежня знаходзіўся ў дзеючай арміі. З 1946-га настаўнічаў на Пухавіччыне, у Талькаўскай СШ. У 1947-49 гадах — аспірант кафедры беларускай літаратуры Мінскага педінстытута імя М. Горкага. Наступныя гады жыцця Алеся Антонавіча звязаны з Магілёвам, дзе ў педінстытуце ён быў дацэнтам, загадваў кафедрай, займаў пасаду дэкана філфака. Кандыдат філалагічных навук. У 1960-м прыняты ў Саюз пісьменнікаў. На творчым рахунку Алеся Макарэвіча — кнігі "Сатыра Кандрата Крапівы" (1962), "Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік" (1963, 2-е выданне: 1969), "Ад песень і дум народных" (1965), "Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы" (1969). Памёр 30 снежня 1967 года.

Уладзімір Хадыка

...Давайце завітаем і ў Цітву, якая раней была цэнтрам воласці Ігуменскага павета. У Цітвянскую школу хадзіў і Міхась Чарот — Міхась Кудзелька. З Цітвы родам паэт Уладзімір Хадыка (нарадзіўся 3 студзеня 1905 года). З маленства быў парабкам. У 1923-м закончыў агульнаадукацыйныя курсы ў Мінску. Працаваў настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Асака, потым — сакратаром Дудзіцкага сельсавета.

Сяргей Грахоўскі, адзін, калі так можна сказаць, з доўгажыхароў беларускай літаратуры, пакінуў цікавыя ўспаміны пра Уладзіміра Хадыку — "Другому сэрцу перадам": "Сапраўдны паэт у пэўнай ступені — прарок, закліканы "глаголом жечь сердца людей", ісці хоць на адзін крок наперадзе падзей. Не рэгістраваць, а прадбачыць важнае ў жыцці, быць разведчыкам і вешчуном наступнага, а часам і ўласнага лёсу. Праз напластаванне гадоў такім паэтам бачыцца мне Уладзімір Хадыка. Шкада, што яго амаль не даследаваная творчасць не стала здабыткам масавага чытача, не дайшла да аматараў паэтычнага слова. Можа, замінае тое, што з пэўнага часу ўсталявалася ўяўленне, нібыта ўся маладнякоўская і белаппаўская паэзія — "бурапенная" самадзейнасць, далёкая ад дасканаласці, глыбіні думкі і пачуццяў. Ёсць у тым нейкая доля праўды, але толькі не ў дачыненні да вершаў Хадыкі." (Грахоўскі С. Так і было. Мн., 1986. — С. 141).

Сяргей Іванавіч, з якім мне давялося ліставацца, а пасля, як я вярнуўся ў Беларусь у 1990 годзе, не аднойчы і сустракацца, заўсёды ва ўспамінах і вусных размовах вызначаўся ўвагай да дэталяў. Імкнуўся ўспаміны пра некага зрабіць насычанымі тым, што памятаў менавіта ён. Таму і гэты нарыс чытаецца наўздзіў цікава. "І асоба яго супадала з ягонай паэзіяй. Ёсць тыпы людзей нечым падобныя адзін да аднаго. Падобных на Хадыку за ўсе гады я не сустракаў. Ён быў асаблівы, прыкметны ў любым натоўпе, запамінальны на ўсё жыццё. Вышэй сярэдняга росту, мяккі ў хадзе (ішоў і крышачку спружыніў ці нават накульгаваў), з густымі, як той "снапок аўса", спелымі валасамі, бледна-ружовы твар, глыбокія сінія-сінія вочы і сакавітыя, па-дзявочы чырвоныя вусны. Як і многія тады, ён хадзіў з кіёчкам, у шчыгульным, часцей чорным, касцюме, у мяккім шэрым капелюшы, у белай кашулі з крухмальным каўнерыкам. Ніколі яго не бачыў неахайным, расхлістаным, непаголеным. Ягоны пагляд прамяніўся вясёлымі іскаркамі, а як ён звонка смяяўся ад дасціпнага жарту, ад смешнай гісторыі! І сам быў майстрам расказаць нешта вясёлае. А калі хваляваўся і гаварыў з запалам, вусны дрыжалі, і нервова перарываліся словы, да заікання. Амаль заўсёды ён хадзіў з вялікім партфелем на два замкі, бо ў ім пэўны час мясцілася ўся рэдакцыя "Полымя", а Хадыка быў яе адзіным штатным работнікам.

У той неўсталяваны час, калі яшчэ не ўсе пазбавіліся ад раппаўскіх крытэрыяў ацэнак, увішныя кан'юнктуршчыкі ўмелі засланіць і закрэсліць многія глыбокія па думцы і дасканалыя па форме творы. Ад іх нападак Хадыку абараніў славуты Мікалай Асееў. Апошні раз мы развіталіся з Хадыкам у снежні 1937 года і не сустракаліся больш ніколі..." (Там жа, с. 143-144).

Тут, відаць, ёсць нейкая блытаніна: бо арыштаваны ж быў Уладзімір Хадыка ў 1936 годзе. Пра гэта сведчаць і энцыклапедычныя дадзеныя, і ўспаміны Станіслава Шушкевіча — пра тое далей. Відавочна, Грахоўскі меў на ўвазе снежань 1936-га. Яшчэ ўрывак з успамінаў С. Грахоўскага: "Сапраўды, кожны радок ягонай лірыкі пісаўся крывёю сэрца. Паэт на пачатку творчай дарогі разумеў сваю місію і спадзяваўся дагаварыць тое, што да яго не мог дагаварыць "народ нямотны". На жаль, не давялося! Як запавет, поўны веры ў будучыню беларускай савецкай паэзіі, сёння чытаюцца Хадыкавы радкі: "Зляту на сухазем'е лістам —/ Ўладар начэй і дзён ўладар./ Вятры па горле галасістым/ Прагоняць вір крыві і хмар./ Тады сваіх здабыткаў кайстру,/ Што не дабраў, што стойваў сам,/ Я перадам другому майстру,/ Другому сэрцу перадам." (Там жа, с. 145-146).

Відаць, самую падрабязную біяграфію, цэлую кнігу ў кнізе, пакінуў пра Уладзіміра Хадыку вядомы дзіцячы паэт, мемуарыст Станіслаў Пятровіч Шушкевіч (1908 — 1991). У кнізе "Вяртанне ў маладосць" (Мінск, 1968) ёсць раздзел "Уладзімір Хадыка". Пісьменнік падрабязна расказвае пра тое, як пазнаёміліся бацькі паэта — швачка Зося (родам з мястэчка Зембін) і Марцін-кавалерыст (слугаваў аднаму з мінскіх паноў, таму ж, што і швачка Зося). Пажаніўшыся, маладыя людзі перабраліся ў Цітву, родную вёску Марціна. Там і нарадзіўся Уладзімір. Сабраўшы багатую фактуру, Станіслаў Шушкевіч узнаўляе многія дэталі з маленства, юначых гадоў паэта. Падае шмат цікавага, пра што ў гісторыі літаратуры ў дачыненні да нашага земляка не згадваецца. Сям'я Марціна і Зосі была шматдзетная. Браты і сёстры Уладзіміра — Вера, Алеська, Люба, Оля, Ніна, Міколка. У суседніх Дудзічах жыў брат Марціна. У час белапольскай акупацыі Уладзімір быў знаёмы з рудзенскім настаўнікам Міхасём Кудзелькам (паэт Міхась Чарот). І, відавочна, разам са старэйшым таварышам удзельнічаў у падпольнай рабоце супраць акупантаў. Пасля, у 1920-я, служыў паэт у Чырвонай Арміі, затым працаваў на гаспадарцы ў роднай вёсцы, сакратарстваў у Дудзіцкім сельсавеце. Падзеяй для паэта сталася вылучэнне яго дэлегатам з'езда Усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў "Маладняк". Перабраўшыся ў Мінск, Хадыка знайшоў сабе месца ў эпіцэнтры літаратурнага жыцця. Вельмі прыязна паставіўся да вершаў маладога і таленавітага мастака слова Янка Купала. Уладзімір Хадыка быў частым госцем у хаце народнага песняра Беларусі. Калі крытыкі-аглабельшчыкі накінуліся на Хадыку за шэраг вершаў, змешчаных

Генадзь Кляўко

у яго першым зборніку "Суніцы", Купала настойліва бараніў маладога творцу. Вядомае і выказванне класіка прыгожага пісьменства пра тое, што такіх лірыкаў, як Хадыка, "у нас не так ужо і многа".

Жыў у Мінску Уладзімір Хадыка па завулку Даўгабродскім, там і быў арыштаваны. З кастрычніка 1937-га прайшло пасяджэнне спецкалегіі Вярхоўнага Суда БССР пад старшынством Васіля Карпіка. Уладзіміра Хадыку на дзесяць гадоў пазбавілі волі, яшчэ на пяць гадоў паражэння грамадзянскіх правоў пасля адбыцця пакарання ў папраўча-працоўных лагерах. "Я нёс знясіленага таварыша ў час снежнага бурану сібірскім стэпам, я плакаў над маленькім лісточкам, з якога даведаўся, што каменная глыба раздушыла майго таварыша ў вапняным кар'еры 1 ліпеня 1940 года, — піша Станіслаў Шушкевіч, які сустракаўся з У. Хадыкам у часе зняволення. — Я ведаю, што спрадвечную батрачку Зосю, маці паэта, выгналі з кватэры сына і на старасці год яна пайшла па людзях шукаць прытулку.

Я ведаю, што засталася бяздомнай жонка паэта Фаіна з невялічкім сынам Уладзікам на руках.

О, якая трагедыя! Гэтую ж няшчасную жанчыну выдаў былы царскі падпалкоўнік Галакціён Венядзіктавіч нямецкім фашыстам, і яе расстралялі як жонку савецкага паэта. Той Галакціён, у якога бацька паэта Марцін быў фурманам, вартаўніком, парабкам.

Сярод попелу тысяч невіноўных людзей каля вёскі Трасцянец ляжыць попел сямігадовага Уладзіміра Уладзіміравіча Хадыкі, сына паэта..." (Шушкевіч С. Вяртанне ў маладосць. Мн., 1968. — С. 85-86).

Непадалёку ад Рудзенска — і Варонічы, радзіма паэта Генадзя Кляўко. Там 1 мая 1932 года ў сялянскай сям'і нарадзіўся гэты яркі творца. Пасля заканчэння Рудзенскай сярэдняй школы (1950) паступіў на філфак Беларускага дзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. З 1954-га, заканчваючы вучобу, адначасова стаў працаваць у рэдакцыі газеты "Калгасная праўда" (цяпер "Белорусская нива"). У 1961-73 гадах — літсупрацоўнік, адказны сакратар часопіса "Вожык". У 1973-78-м — намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Полымя". Член СП СССР з 1964 года. Узнагароджаны медалём. Памёр 21 жніўня 1978 года. Упершыню з вершамі ў рэспубліканскім друку выступіў у 1950 годзе. Аўтар зборнікаў вершаў "Абветраныя далягляды" (1962), "Сто крокаў" (1967), зборнікаў вершаў і паэм "Прыстань" (1974), "Плуг" (1978), "Вязьмо" (1984), зборнікаў гумарыстычных вершаў і мініяцюр "Лайдак і кнопкі" (1964), "Каб не сурочыць" (1971), "Што праўда, то не грэх..." (1971), "Падкова над парогам" (выбранае, 1979). Для дзяцей выдаў кніжку вершаў "Першы салют" (1964). Перакладаў на беларускую мову творы пісьменнікаў народаў СССР. У 1975-м у яго перакладах выйшаў зборнік паўднёваасецінскай паэзіі "Трубіць алень".

Шалягі, Цітва, Варонічы... Простыя, шараговыя вясковыя паселішчы, а колькі розных літаратурна-мастацкіх артэфактаў звязана з іх гісторыяй. І так — не толькі на Рудзеншчыне, Пухавіччыне, але і па ўсёй Беларусі!.. Не забыліся б нашы нашчадкі пра гэтыя ўнікальныя адрасы літаратурнай памяці.

Алесь Карлюкевіч

Шанаваць. Памятаць. Вывучаць

19 цікавых дакладаў прагучала на "Беларускіх чытаннях" у Даўгаўпілсе. Канферэнцыя сабрала навукоўцаў і даследчыкаў з пяці краін.

UZDIM.LV

Другая канферэнцыя "Беларускія чытанні" прайшла ў анлайн-фармаце

У лютым, напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы, Даўгаўпілскі Цэнтр беларускай культуры (ЦБК) правёў у рэжыме анлайн ужо другую канферэнцыю "Беларускія чытанні". На гэты раз у ёй паўдзельнічалі даследчыкі, навукоўцы з Латвіі, Беларусі, Польшчы, Чэхіі ды Эстоніі.

ZOOM у дапамогу

Першая Міжнародная канферэнцыя "Беларускія чытанні" прайшла год таму ў Даўгаўпілсе, сабрала спецыялістаў, якія вывучаюць розныя дачыненні Латвіі ды Беларусі, беларускую дыяспару за мяжой. Форум і ў 2020-м быў прымеркаваны да Дня роднай мовы, а па выніках яго стала зразумелым: варта добрую справу прадоўжыць. "Беларускія чытанні", акцэнтую ўвагу, гэта не навукова-прыкладная канферэнцыя. Гэта максімальна шырокая пляцоўка для міжкультурнага дыялогу з навуковым ухілам.

Сёлета з-за каранавірусных абмежаванняў канферэнцыя перанеслася ў інтэрнэт-асяроддзе, а ZOOM "адкрыў" межы: дзякуючы гэтай тэхналогіі да Латвіі й Беларусі далучыліся Польшча, Чэхія, Эстонія. Прагучала на чытаннях 19 дакладаў, па тэматыцы падзеленыя на тры тэмы: культура, гісторыя, дыяспара.

Удзельнікаў імпрэзы вітаў намеснік старшыні Даўгаўпілскай гарадской думы Яніс Дукшынскі. Падкрэсліўшы значнасць падзеі, ён распавёў пра ўдзел горада ў конкурсе на статус "Культурнай сталіцы Еўропы-2027".

Генеральны консул Беларусі ў Даўгаўпілсе Ілья Лапуць у вітальнай прамове адзначыў: "Беларускае сэрца для Даўгаўпілса заўсёды адкрытае. Мы заўсёды ўмелі знаходзіць агульную мову, нягледзячы на любыя складанасці, любыя праблемы, якія вельмі часта пракочваліся праз нашыя краіны. Мы тут жылі, мы застаемся добрымі суседзямі. Гэта трэба шанаваць, гэта трэба памятаць, гэта трэба вывучаць".

Культуры ўзбагачаюцца праз дыялог

Адкрыў працоўную частку канферэнцыі даклад Аляксандра Сушы — кандыдата культуралогіі, намесніка дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Ён прысвячаўся выданню букваро́ў для беларускіх школ Латвіі ў міжваенны перыяд. Коратка пазначыў дакладчык дзейнасць Беларускага культурна-асветніцкага таварыства "Бацькаўшчына" (1921 год заснавання, першы старшыня — Ян Харлап) у наладжванні беларускай адукацыі ў міжваеннай Латвіі. У той перыяд дзейнічала 60 беларускіх школ. Дзеці вучыліся чытаць на роднай мове па кнігах: А. Смоліч "Зорка" (1922 г., Вільня), К. Езавітава "Беларуская школа" (1926, Рыга), Я. Лёсіка "Наша Крыніца" (1927 г., Рыга), В. Бароўскай "Васількі" (1935 г., Рыга).

Кандыдат гістарычных навук Раіса Зянюк (НАН Беларусі) даследавала й расказала, як ішло навучанне й падрыхтоўка каталіцкіх святароў у Краслаўскай семінарыі аж да часу яе закрыцця. Досведам выкладання гісторыі латышскай літаратуры ў плыні дысцыпліны "Літаратура блізкага замежжа" дзялілася кандыдат філалагічных навук Ганна Гладкова (Віцебскі дзяржуніверсітэт імя П. Машэрава). Адзначу, што наш ЦБК і ўніверсітэт звязвае пагадненне аб супрацоўніцтве. Тэму прадоўжыў Андрэй Ціхаміраў (Гродзенскі музей гісторыі рэлігіі), які вывучае пераклады латышскай літаратуры на беларускую мову на пачатку XXI стагоддзя. А доктар філалогіі Міраслаў Янковяк (Пражскі ўніверсітэт) прааналізаваў беларускія дыялекты ў Латвіі. Дарэчы, на гэтую тэму ўжо выйшлі дзве яго манаграфіі. Даследчык Андрэй Герберг (Віцебскі дзяржаўны медуніверсітэт) вывучае архітэктурны стыль, які назваў "Латгальскім барока". Старадаўнія будынкі з чырвонай цэглы яшчэ захаваліся і ў Віцебску.

Сляды на дарогах гісторыі

Пра "Ганненскі кірмаш", які з даўняга штогадовага рэгіянальнага кірмашу ў нашым часе адрадзіўся ў якасці фестывалю, распавялі прадстаўнікі райцэнтра Зэльва (Гродзенская вобласць). Менавіта на тэме фестывальнага кірмашу й пазнаёміліся, сталі партнёрамі Даўгаўпілскі ЦБК і Зэльвенскі райаддзел культуры. А вось імя гісторыка Аляксея Сапунова нечакана злучыла Віцебск і Даўгаўпілс. Бюст заслужанаму земляку цяпер устаноўлены ля будынка Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П. Машэрава. А ў Даўгаўпілсе напярэдадні яго 170-х угодкаў выдалі працу гісторыка пра Польскія Інфлянты. Пра тое займальна расказала супрацоўніца Цэнтра рускай культуры з Даўгаўпілса Галіна Іванова.

Яшчэ адну адметную асобу згадвалі ў часе чытанняў: Аляксандру Бельцавую, вядомую у Латвіі мастачку. Яе наша дыяспара лічыць беларускай мастачкай, а дакладчыца Ларыса Каймінь прадставіла творчасць спадарыні Аляксандры як сімбіёз культур.

Выклікаў дыскусію даклад Максіма Каралёва (Варшаўскі ўніверсітэт), які шмат гадоў вывучае культуралагічныя сувязі Латвіі ды Беларусі, шмат публікуецца. На гэты раз даследчык гаварыў пра выдадзеную ў Мінску ў 1933 годзе кнігу Янкі Доўгага "Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі". Як аказалася, назва яе не адпавядае зместу. А гісторык Аляксандр Ніканаў (Віцебскі дзяржаўны медуніверсітэт) расказаў пра ўдзел латышоў у партызанскім руху ў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны.

Сваю гісторыю ўжо мае інтэлектуальна-спаборніцкі рух "Што? Дзе? Калі?", які ўзнік у канцы XX стагоддзя. Як супрацоўнічаюць, куды рухаюцца клубы знаўцаў Латвіі ды Беларусі — пра тое распавёў даследчык Жан Бадзін (Даўгаўпілскі ўніверсітэт).

Дыяспара: мы памятаем свае карані

Даўгаўпілскі Цэнтр беларускай культуры, як арганізатар канферэнцыі, таксама прадставіў два даклады. Адзін быў прысвечаны нацыянальнай кухні як феномену ў сістэме культурных маркераў беларусаў Даўгаўпілса, другі — конкурсу эсэ, які праводзіўся ў нас да 100-х угодкаў пісьменніка Івана Шамякіна, творы якога ў свой час многія з нас вывучалі ў школе.

Плённым аказаўся і абмен досведам працы паміж беларускімі таварыствамі Даўгаўпілса, Таліна й Нарвы. Цэнтр нацыянальных меншасцяў "Радзіма" ў Таліне, напрыклад, папулярызуе беларускую культуру сярод эстонскіх дзяцей. А дзейнасць нядзельнай школы "Вясёлка" Даўгаўпілскага таварыства "Уздым" арыентаваная найперш на дзяцей з сем'яў, якія маюць беларускія родавыя карані. У часе размовы кіраўнікі Нарвскага таварыства "Сябры" засяродзілі ўвагу на тым, што ў суполцы, што дзейнічае ў эстонскім горадзе, практычна не гучыць родная беларуская мова.

Дыктант як пазнавальны тэст

У плыні II-й Міжнароднай канферэнцыі "Беларускія чытанні" прайшла традыцыйная дыктоўка па беларускай мове — таксама анлайн. Завуч Рыжскай беларускай школы імя Я. Купалы Ганна Іванэ выбрала для дыктоўкі ўрывак з рамана-хронікі "Людзі на балоце" Івана Мележа: сёлета яго 100-я ўгодкі. На гэтую тэму спадарыня Ганна як настаўніца беларускай мовы й літаратуры зрабіла займальны, эмацыйны даклад на канферэнцыі. Дыктоўку пісалі супрацоўнікі ЦБК і Амбасады Беларусі ў Латвіі, Генконсульства Беларусі ў Даўгаўпілсе, педагогі Рыжскай беларускай школы, актывісты беларускіх таварыстваў "Уздым" (Даўгаўпілс), "Мара" (Ліепая), "Вытокі" (Рыга), "Сябры" (Нарва, Эстонія). Лісты адаслалі на праверку ў Рыжскую беларускую школу.

Як лічаць арганізатары, на "Беларускіх чытаннях" удалося захаваць цёплую атмасферу, сустрэцца са старымі сябрамі, завязаць новыя кантакты. Па матэрыялах першай канферэнцыі ўжо выдадзены зборнік, які атрымалі ў падарунак усе ўдзельнікі другіх "Беларускіх чытанняў" па пошце. А другі зборнік будзе значна больш аб'ёмным.

Жанна Раманоўская,
кіраўніца Цэнтра беларускай культуры, г. Даўгаўпілс



UZDIM.LV

Жанна Раманоўская – адна з арганізатараў "Беларускіх чытанняў"

"Жавароначкі" пад небам Айчыны

35-я ўгодкі сёлета ў дзіцячага ўзорнага калектыву, які працуе пад кіраўніцтвам Наталлі Баяльскай — таксама юбіляркі

З чаго пачынаецца песня? Відаць, з пачуццяў, што імкнуцца пераўтварыцца ў гарманічныя гукі. Так і ў птушак бывае, так і ў людзей... А ў гурта "Жавароначкі", які хораша, з густам, з прыгожымі спевамі ды вялізным тортам адзначаў нядаўна 35-я ўгодкі, песні пачынаюцца з Наталлі Паўлаўны. Настаўніца спеваў, якой сёлета 65, не проста ўсе гады кіруе сваімі "птушанятамі" (а колькі ўжо іх у гурце перамянілася!..) — Наталля Паўлаўна ўсіх іх любіць. У 2004-м яна ўшанавана медалём "За асабісты ўнёсак у развіццё культуры Беларусі", аўтар песеннага зборніка "Жавароначкі, прыляціце!". У яе творчым калектыве рэалізуюць свае таленты і першакласнікі, і студэнты, і навучэнцы каледжаў. Паядноўвае ж іх не толькі сама кіраўніца, але й любоў да беларускіх песень, танцаў, мелодый — да вялікай, шматграннай народнай культуры, якую маем у спадчыну ад папярэднікаў.

Наталля Баяльская і некаторыя артысты з яе "Жавароначкаў"

Хоць месца творчай прыпіскі ў гурта цяпер — у мінскім гарадскім Палацы культуры, але важным філіялам застаецца й 206-я мінская школа, што ў паўднёва-заходнім мікрараёне Малінаўка, па вуліцы Ясеніна, 101. Там ёсць прасторная зала для рэпетыцый, прыдатная атмасфера для юных артыстаў. Дырэктарка школы Таццяна Мікалаеўна Радзько не проста ганарыцца скарбам пад назвай "Жавароначкі", але й падтрымлівае таленты, з задавальненнем наведвае канцэрты гурта. Ведае юных артыстаў. На святочнай імпрэзе, напрыклад, згадала галасістую Ганну Мінец з трэцяга класа. З гэтай жа школы ў гурце Валерыя Зянько, Ірына Мяркулава. Між тым 206-я даступная, адкрытая для юных талентаў з іншых месцаў. Прыкладам, Карына Грыневіч — з 155-й школы, Маргарыта Гурская, Ангеліна Карчэўская, Вікторыя Багумаз, Ангеліна Молчан — з 205-й. Марыя Корац навучаецца ў Каледжы мастацтваў. Юры Астрамовіч — студэнт, але застаецца ў творчай чарадзе, бо, прызнаецца, палюбіў мастацтва, якое дапамагае яму жыць паўнакроўным жыццём. І Стас Жуковіч, хоць прадаўжае вучобу ў будаўнічым каледжы, знаходзіць магчымасць кожную рэпетыцыю быць з сябрамі, у творчым калектыве.

Усіх нават цяперашніх "Жавароначкаў" і не пералічыць: іх амаль 40. І кожны прыўносіць у агульную творчасць жывую часцінку сэрца, сваю нотку, мелодыю, вібрацыю душы. Дарэчы, новая юбілейная праграма ў "Жавароначкаў" мае назву: "Спявай, душа Беларусі!". Яна ўвабрала ў сябе вясновыя, летнія, восеньскія ды зімовыя абрадавыя дзеянні, па-майстэрску адаптаваныя да сучаснай сцэны. Пад кожны абрад у артыстаў — свае сцэнічныя касцюмы. А дадайце яшчэ ў гэтую плынь традыцый бліскучыя промні дзіцячай, маладзёжнай весялосці, карагоднасцэнічных спеваў і дзеяў — і вы зразумееце, чаму так хораша пачувае сябе кожны на канцэртах "Жавароначкаў": і юныя артысты, і ўдзячныя гледачы-слухачы.

І на гэты раз вельмі шчыра, з адкрытымі сэрцамі, гарачымі апладысментамі сустракалі мы "Жавароначкаў" на сцэне мінскага гарадскога Палаца культуры, што па вуліцы Маякоўскага, пры знакамітым Лошыцкім парку. Раней, нагадаю, то быў ДК Камвольнага камбіната, і новае жыццё абноўлены будынак распачаў з мая 2018-га. Юбіляраў прыйшлі павіншаваць прадстаўнікі як гарадскіх улад, так і Саўміна, Мінадукацыі, Мінкультуры, Беларускага фонда культуры, дэпутаты Нацыянальнага сходу. Былі дырэктары мінскіх школ, бацькі й родныя артыстаў-"жавароначкаў", былыя ўдзельнікі гурта. Віншавалі калег, выступалі таксама іншыя калектывы: народны ансамбль народнай песні ды музыкі "Шчодрыца", ансамбль народнай музыкі "Кросны" Мінскага каледжа мастацтваў, выхаванцы Акадэміі мюзікла "Рэвю", а таксама салістка Тэатра фальклору "Матуліна хата" Кацярына Пяршлевіч.

Святочная імпрэза падарыла радасць як дзецям, так і дарослым. І шмат радасці было, калі ў фінале канцэрта на сцэну Палаца культуры выкацілі вялізны торт! Кранальна было бачыць, як удзячныя юбілярам — і Наталлі Паўлаўне, і "Жавароначкам" — былыя выхаванцы гурта вышлі на сцэну з вялікім кошыкам кветак. Спадзяюся, і цяпер агонь творчасці, распалены ў іх сэрцах, не згасае.

Мікола Котаў,
фалькларыст, удзельнік свята

ПАЗІЦЫЯ

Разам песню заспявалі

Актывісты беларускага таварыства "Уздым" зладзілі 7 мая літаратурна-музычную імпрэзу, прысвечаную 76-годдзю Вялікай Перамогі, на інтэрнэт-пляцоўцы ZOOM.

У святочнай імпрэзе паўдзельнічалі шаноўныя госці: консул Генеральнага консульства Беларусі ў Даўгаўпілсе Галіна Найдзёнава, старшыня Саюза беларусаў Латвіі Алёна Лазарава, сябры беларускай суполкі ў Іарданіі Аксана Чамеза ды Надзея Аль-Алімат, сябры Славянскага таварыства "Узоры" з Ліван Лідзія Знотыня й Яўген Пашкевіч, сябар Рускай пісьменніцкай арганізацыі ў Даўгаўпілсе Валянціна Прудзікава. Нашае таварыства "Уздым" прадстаўлялі Таццяна Дзянісава, Лілія Воранава, Яніна Юзэфовіч, Алена Радзівонава, Ніна Прусакова, Рэгіна Родзікава, Валеры Амбросаў ды я.

Пачалася інтэрнэт-сустрэча з Мінуты маўчання ў памяць пра загінулых у Вялікай Айчыннай вайне. Затым удзельнікі святочнай імпрэзы чыталі любімыя вершы, спявалі песні на ваенную тэму. То былі творы Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага, песня на словы Адама Русака "Ой, бярозы ды сосны", песня на словы Станіслава Валодзькі і музыку Яўгена Лівіціна "Ля Вечнага агню". Чыталіся вершы й даўгаўпілскіх паэтаў Зянона Бурага, Паўла Макаленкіна, Ліліі Воранавай, а таксама ліванскай паэтэсы Галіны Калянковай. Мы віншавалі адзін аднаго са святам. Консул Галіна Найдзёнава, выказаўшы прачулыя словы ад сябе асабіста, перадала віншаванне ад Генконсула Ілы Лапуця. А на завяршэнне сустрэчы мы разам спявалі знакамітую песню"День Победы".

Станіслаў Валодзька,
г. Даўгаўпілс

ПЕРАД ТВАРАМ ВЕЧНАСЦІ

Адыходзяць ветэраны. І музеі...

З Кішынёва прыйшла тужлівая вестка: не стала Уладзіміра Вайцэховіча — ветэрана вайны, аднаго з актывістаў беларускай дыяспары ў Малдове

Напісаў нам у рэдакцыю, што памёр ветэран, ягоны паплечнік па грамадскай рабоце ў беларускай суполцы мастак Вячаслаў Ігнаценка: "Наш зямляк, якім усе беларусы Малдовы ганарыліся, адышоў у вечнасць 28 сакавіка".

Вячаслаў згадвае: падрабязна пісаў пра старэйшага сябра ў тэксце "Музей пад вінаграднымі лозамі" (20.05.2010). Уладзімір Вайцэховіч нарадзіўся 10 мая 1924 года ў вёсцы Скобраўка, што на Пухавіччыне. Абараняў Маскву, камандаваў узводам мінамётнай роты пад Сталінградам, дзе атрымаў і першы ордэн, Чырвонай зоркі, і першую кантузію. У складзе 144 палка пад камандаваннем Васіля Маргелава прайшоў з жорсткімі баямі да Вены. І ў пасляваенны час ветэран доўга заставаўся ў страі: стаў доктарам тэхнічных навук, працаваў у Аграрным універсітэце, быў Ганаровым грамадзянінам Рэспублікі Малдова. Пры дапамозе моладзі, студэнтаў у памяць пра гвардзейцаў, ветэранаў 49-й Херсонскай Чырванасцяжнай ордэна Суворава дывізіі стварыў музей — пра тое і быў аповед у публікацыі.

Уладзімір Вайцэховіч

Аднак, паведамляе Вячаслаў Ігнаценка, і музея таго ўжо няма: тэрыторыю двара, дзе ён быў, гарадскія ўлады, кажуць, прадалі пад новае будаўніцтва: "Актывісты дыяспары раней выходзілі на гарадскія улады, але ж нам не далі музей прыватызаваць, каб стаў уласнасцю Вайцэховіча, а потым і дыяспары. Вось і аказаўся музей — нічый".

Рыгор Гарэшка

2021: Год народнага адзінства

Чытайце газету ў інтэрнэце на партале zviazda.by

Заснавальнік: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»"
Галоўны рэдактар Іван ЖДАНОВІЧ

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Пакой 907.
E-mail: golas_radzimy@tut.by
Тэлефон: + 375-17-3111726

Рэдакцыйнае пасведчанне №61. Выдадзена 16.07.2018 года Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Выдавецкі дом «Звязда»". Дырэктар – галоўны рэдактар Алесь Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Аб'ём выдання: 2 друк. арк.
Падпісана да друку: 26.05.2021 г.
Наклад 166.
Заказ –
Выходзіць 1 раз у месяц

Месца друкавання: Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "БудМедыяПраект". ЛП №02330/71 ад 23.01.2014. Вул. Веры Харужай, 13/61. 220123 Мінск, Рэспубліка Беларусь

© "Голас Радзімы", 2021

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца й не рэцэнзуюцца. Пазіцыі рэдакцыі ды аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.